№ 75(657)

Чацвер, 29 красавіка 1999 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г. на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень

Кошт: у кіёсках і крамах — 10000 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб Колас

На думку генерала Захаранкі, Аляксандр Лукашэнка праводзіць "зачыстку" палітычнага поля напярэдадні плануемых ім прэзідэнцкіх выбараў

На думку былога міністра ўнутраных спраў, а цяпер актыўнага дзеяча апазіцыі Юрыя Захаранкі, сёння ў Беларусі, па ўказанні прэзідэнта Лукашэнкі, ажыццяўляецца "зачыстка" палітычнага поля. Яе мэта — нейтралізаваць на працягу некалькіх месяцаў усіх прыкметных апазіцыйных палітыкаў, з тым каб правесці плануемыя кіраўніком дзяржавы прэзідэнцкія выбары. Аб гэтым генерал Захаранка заявіў у інтэрв'ю газеце "Навіны" ад 27 красавіка гэтага года.

Як лічыць былы міністр, зараз А.Лукашэнка можа "смела ісці на выбары, таму што больш спрыяльнай эканамічнай сітуацыі ў яго ўжо не будзе, да таго ж трэба рэабілітавацца перад Еўропай, прыкрыцца меркаваннем народу". Паводле слоў Ю.Захаранкі, А.Лукашэнка "сам прызначыць сабе саперніка, пагуляецца, і ў выніку застанецца тое, што і было". Менавіта для гэтага, перакананы генерал, і праводзіцца "зачыстка", асноўны ўдар якой накіраваны па крыле дэмакратычнага руху з "былых", уключаючы і самога Захаранку.

Як ужо паведамляў БелаПАН, у дачыненні да гэтага палітыка ўзбуджана крымінальная справа, яму інкрымінуецца "ўздзеянне на работніка міліцыі з мэтай перашкодзіць выкананню ім службовых абавязкаў". За гэтым стаяць тэлефонныя званкі асабістага характару тром кіраўнікам упраўлення ўнутраных спраў Гомельскага аблвыканкама — былым калегам Ю.Захаранкі. Пасля гэтых гутарак усе трое напісалі рапарты аб "уздзеянні" на іх. "Але як можа ўздзейнічаць чалавек, — заўважае Юрый Захаранка, — які знаходзіцца на пенсіі, не маючы ніякіх уладных і палітычных паўнамоцтваў?". І тым не менш, перакананы генерал, "правячыя вярхі страцілі сілавыя структуры, і іх контрзахады падобныя на агонію". Сёння, калі супраць Захаранкі ўзбуджана крымінальная справа, работнікі міліцыі, сцвярджае ён, гатовы яму дапамагаць, прадастаўляць прыстанішча, абараняць.

Юрый КУЗНЯЦОЎ, БелаПАН.

С.Лінг прапанаваў прэзідэнту А.Лукашэнку або адправіць урад у адстаўку, або даць яму магчымасць выправіць сітуацыю ў эканоміцы ў другім квартале 1999 года

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прызнаў працу ўрада рэспублікі па выніках першага квартала 1999 года нездавальняючай. Выступаючы на пашыраным пасяджэнні Савета міністраў, ён падкрэсліў, што з 12-ці прагнозных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця рэспублікі ў першым квартале выкананы толькі адзін. У адказ прэм'ер-міністр Сяргей Лінг прама ў зале пасяджэння звярнуўся да кіраўніка дзяржавы з прапановай выбраць адзін з двух варыянтаў далейшых дзеянняў — або адправіць урад у адстаўку, або даць яму магчымасць выправіць сітуацыю на працягу другога квартала, каб да канца года выйсці на прагнозныя паказчыкі.

Кіраўнік урада прызнаў, што аб'ём вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі знізіўся за квартал на 5 працэнтаў, інвестыцыі ў асноўны капітал паменшыліся на 3,2 працэнта, уведзена ў эксплуатацыю толькі 510 тысяч квадратных метраў жылля, што складае 98 працэнтаў ад задання. Паводле інфармацыі прэм'ера, на 3,9 працэнта скараціўся аб'ём рознічнага тавараабароту, на 31 працэнт — аб'ём знешняга гандлю. Прадпрыемствы аплацілі ў гэты перыяд толькі 42 працэнты сумы па ўзятых раней крэдытах. Вельмі вострай праблемай застаецца таксама рост цэн і дэвальвацыя нацыянальнай валюты.

Аляксандр ПАПОВІЧ, БелаПАН.

Выйшла ў свет кніга Сямёна Шарэцкага "Трагедыя Беларусі, або Што такое сапраўдны лукашызм"

У беларускай сталіцы выйшла ў свет кніга старшыні Вярхоўнага Савета 13-га склікання Сямёна Шарэцкага "Трагедыя Беларусі, або што такое сапраўдны лукашызм". У яе ўвайшлі артыкулы аўтара, апублікаваныя ў беларускіх выданнях за апошнія два з паловай гады, тэксты яго публічных выступленняў, заявы Вярхоўнага Савета і яго прэзідыума, напісаныя пры непасрэдным удзеле С.Шарэцкага. На думку спікера, "лукашызм, як называе новую з'яву дыктатарскага рэжыму ў Беларусі сам народ, — гэта не проста паводзіны неўраўнаважанага па характары прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і яго паплечнікаў, а грамадская і палітычная з'ява, якая пачала набываць міжнародную сілу. Лукашызм — гэта новы рэцыдыў дыктатарскага рэжыму ў сучасных еўрапейскіх умовах, гэта сумесь фашызму, сталіншчыны і махровага папулізму. І калі не прыняць тэрміновых мер, то, як ракавая пухліна, ён пачне не толькі ўзмацняць сваю ўладу на Беларусі, але і будзе ўвесь час старацца распаўсюдзіць яе і на іншыя рэгіёны". Ва ўступным слове С.Шарэцкі выказвае надзею, што яго кніга "дапаможа чытачам больш дакладна зразумець, што такое лукашызм і якую небяспеку ён уяўляе для свету".

Дзмітрый УЛАСАЎ, БелаПАН.

Гэты прэпарат выводзіць з арганізма ад 40 да 70 працэнтаў радыенуклідаў

Медыцынскія наступствы катастрофы на Чарнобыльскай АЭС сталі тэмай рэспубліканскага семінара, які прайшоў у Гомелі. На ім адзначалася, што за апошнія гады рэзка павялічылася колькасць анкалагічнай паталогіі, захворванняў эндакрыннай і сардэчна-сасудзістай сістэм. З гэтай нагоды інстытут радыяцыйнай бяспекі "БелРАД" мае намер звярнуцца ва ўрад з хадайніцтвам аб будаўніцтве ў Беларусі лініі па вытворчасці лекавага прэпарату "Яблапект". Ён выводзіць з арганізму да 40, а пры комплексным лячэнні і да 70 працэнтаў радыенуклідаў, перш за ўсё радыецэзію. Гэты прэпарат закупляецца пакуль ва Украіне.

Ірына МАКАВЕЦКАЯ.

Заява прадстаўнікоў грамадскіх палітычных арганізацый горада Гродна

Трынаццаць гадоў таму нашу Радзіму спасцігла ядзерная катастрофа. У мірны час беларускі народ напаткаў лёс ахвяр Хірасімы і Нагасакі. Аварыя на Чарнобыльскай атамнай станцыі стала трагічным завяршэннем існавання камуністычнай імперыі. Сярод іншых народаў Савецкага Саюза найбольш ахвяр на алтар крывавай імперыі паклалі беларусы. Мільёны нашых суайчыннікаў загінулі ў войнах, у камуністычных і фашысцкіх канцэнтрацыйных лагерах. Крамлёўскія ўладары заўсёды рабілі Беларусь прадметам гандлю, распараджаючыся яе тэрыторыяй як разменнай манетай. Наш народ быў падвергнуты страшэннаму генацыду. У выніку былі амаль знішчаны гістарычная памяць і мова беларусаў. У давяршэнне да ўсяго на галовы людзей Беларусі абрынулася большасць чарнобыльскага радыяцыйнага попелу.

Мы добра памятаем, як кіраўніцтва БССР хавала праўду пра Чарнобыль, як людзей запэўнівалі, што ім нічога не пагражае. Толькі пасля атрымання незалежнасці Беларусі свет даведаўся пра сапраўдныя наступствы катастрофы. Не ўсё рабілася, каб зменшыць пакуты і колькасць ахвяраў, але такая дзейнасць вялася. Сітуацыя пагоршылася пасля прыходу да ўлады рэжыму Аляксандра Лукашэнкі. Ён зноў вярнуў на высокія пасады кіраўнікоў часоў БССР. Растаптаў Канстытуцыю, на якой прысягаў. Знішчыў на Беларусі дэмакратычныя інстытуты. Давёў да міжнароднай ізаляцыі краіну. Зноў беларусы засталіся сам-насам з чарнобыльскай бядой.

У выніку некампетэнтнасці кіраўніцтва эканоміка Беларусі даведзена да катастрафічнага стану. Антыдэмакратычныя дзеянні прэзідэнта шматразова парушалі міжнароднае права. Каб пазбегнуць адказнасці, Лукашэнка імкнецца ўцягнуць шматпакутную Беларусь у ядзернае супрацьстаянне з усім цывілізаваным светам. Гэта можа прывесці да новай жахлівай трагедыі. Разам са сваімі расійскімі хаўруснікамі, якім засціць вочы імперская прагнасць, рэжым Лукашэнкі імкнецца знішчыць незалежнасць Беларусі.

На пачатак мая прызначана падпісанне ў Гродне так званай "саюзнай дамовы". Тое, што гэта можа здарыцца ў нашым горадзе, з'яўляецца звышцынізмам і абразай нашай нацыянальнай годнасці. Менавіта ў Гродне 205 гадоў таму пад дуламі расійскіх пушак адбыўся апошні Сойм Рэчы Паспалітай, які зацвердзіў акупацыю беларускіх земляў Расійскай імперыяй.

Мы лічым, што далучэнне Беларусі да Расіі нясе нашай краіне і ўсяму свету небяспеку фізічнага знішчэння. Ужо неаднаразова з дзяржаўных трыбун Мінска і Масквы гучалі словы пра вяртанне на Беларусь ядзернай зброі. Расійскія "чырвона-карычневыя" і прэзідэнт Беларусі выступаюць за ваенны саюз з Югаславіяй, які непазбежна паставіць свет на мяжу трэцяй сусветнай вайны.

Мы лічым, што наш народ дастаткова адпакутаваў у XX стагоддзі, каб у XXI жыць у вольнай, бяз'ядзернай краіне, якая сябруе з суседзямі і не з'яўляецца патэнцыйным палігонам для ядзерных эксперыментаў. Мы рашуча пратэстуем супраць прыезду ў наш горад расійскіх, беларускіх і югаслаўскіх мілітарыстаў-"інтэграстаў".

Мы звяртаемся да жыхароў Гродна. Сёння, як ніколі, на нас ляжыць адказнасць за лёс Беларусі і будучыню Еўропы. Не дапусцім, каб Гродна стаў месцам пахавання надзей народаў на мірнае і заможнае жыццё! Давайце ўсімі магчымымі законнымі сродкамі спынім злачынныя намеры і ўратуем свет ад катастрофы.

Данута БІЧЭЛЬ-ЗАГНЕТАВА,
старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў,
Эдвард ДЗЬМУХОЎСКІ,
старшыня маладзёжнага альянса імя Вітаўта Вялікага,
Дзмітрый КІСЕЛЬ,
сябра Гродзенскай Рады Таварыства беларускай мовы,
Алесь КРАЎЦЭВІЧ,
сябра Рады Беларускага краязнаўчага таварыства імя Тодара Нарбута,
Алесь ЛОБАН,
сябра Гродзенскай гарадской Рады
Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады,
Мікалай МАРКЕВІЧ,
старшыня Гродзенскай філіі Беларускай асацыяцыі журналістаў,
Андрэй МЯЛЕШКА,
старшыня Гродзенскай Рады Маладога фронту,
Андрэй ПАЧОБУТ,
сябра Рады Гродзенскага маладзёжнага антыфашысцкага цэнтра,
Віктар САЗОНАЎ,
сябра Гродзенскай Рады руху БНФ "Адраджэньне",
Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ,
старшыня Гродзенскай абласной філіі фонда імя Льва Сапегі.

Дембель-99

20 июля 1999 года в соответствии с Конституцией 1994 года заканчивается пятилетний срок президентских полномочий Александра Лукашенко

Верховный суд Республики Беларусь отказал КНГ ОБСЕ в допуске на судебное заседание, рассматривающее дело лиц, обвиняемых в убийстве Е.Миколуцкого

В сообщении для прессы, поступившем из Консультативно-наблюдательной группы ОБСЕ, говорится, что в письме от 17 апреля 1999 года, подписанном судьей Ф.И.Чубковец, было сообщено, что судебное заседание объявлено закрытым и поэтому сотрудникам КНГ ОБСЕ отказано присутствовать на судебном заседании. 26 апреля 1999 года Министерство иностранных дел сообщило КНГ, что судебное заседание было действительно закрытым, поскольку там затрагивалась государственная тайна. Характер государственной тайны не был определен. Е.Миколуцкий, председатель Контрольной палаты по Могилевской области, убит в результате взрыва бомбы 6 октября 1997 года. Четыре человека задержаны и обвинены в убийстве; один из них якобы покончил жизнь самоубийством, находясь в следственном изоляторе.

Это первый случай, когда члену Консультативно-наблюдательной группы ОБСЕ отказано в доступе к человеку или в наблюдении за процессом. Заявление пресс-секретаря Верховного суда и сообщения в прессе о том, что члены ОБСЕ присутствовали или могли присутствовать на суде, не соответствуют действительности.

Падчас візіту ў Кітай дэлегацыі Мінскага аўтазавода падпісаны пратакол аб намерах па стварэнні сумеснага прадпрыемства па зборцы аўтамабіляў МАЗ

Пратакол аб намерах па стварэнні сумеснага прадпрыемства па зборцы аўтамабіляў Мінскага аўтамабільнага завода (МАЗ) падпісаны з кіраўніцтвам правінцыі Далянь падчас візіту ў Кітайскую Народную Рэспубліку (КНР) кіраўніцтва МАЗа. Як паведаміў журналістам па прыбыцці з Кітая генеральны дырэктар ВА "БелаўтаМАЗ" Валянцін Гурыновіч, кітайскі бок цікавяць магістральныя цягачы і некаторая іншая тэхніка, вырабляемая Мінскім аўтазаводам. У Кітаі ўжо дзейнічае зборачная вытворчасць аўтамабіляў вядомай фірмы TATRA, аднак, як адзначыў В.Гурыновіч, тэхніка Мінскага аўтазавода ні ў чым ёй не саступае. У сувязі з гэтым МАЗ ставіць перад сабой задачу стаць удзельнікам ажыццяўляемай у Кітаі праграмы развіцця аўтамабілебудавання.

Аляксей АРЭШКА.

Стыхія

Машкара ідзе ў атаку

Сапраўдную барацьбу з машкарой, якая нападае на грамадскую і ўласную жывёлу, што знаходзіцца на пашы, даводзіцца весці ветэрынарным і заатэхнічным работнікам Брэстчыны. Як паведамілі карэспандэнту ў аблаграхарчы, хвароба сімулідатаксікозу, якую выклікаюць укусы гэтых насякомых, зафіксавана ў 12 раёнах вобласці. Захварэла амаль 4 тысячы галоў буйной рагатай жывёлы. Ёсць і даволі істотныя страты: 23 жывёліны здохлі і 166 галоў давялося прырэзаць.

Паводле слоў спецыялістаў, гэтай ядавітай машкары цяпер на Брэстчыне развялося як ніколі шмат. Прычым заўважана нават яе мутацыя, якая адбылася ў выніку пакуль яшчэ невядомых прычын. З зялёных насякомыя "перафарбаваліся" ў карычневы колер і ў параўнанні з мінулагоднім сталі ў два разы большыя.

Цяпер паўсюдна ветэрынарная служба вядзе апрацоўку жывёлін спецыяльнымі "адпужвальнымі" сродкамі. Ужо апрацавана ў розных раёнах звыш 13 тысяч кароў і маладняку. Адна такая апрацоўка можа адпужваць мошак на працягу 40 дзён. Аднак сродкі гэтыя вельмі дарагія. Напрыклад, каб апрацаваць усё пагалоўе вобласці, спатрэбіцца не менш як 55 мільярдаў рублёў. Такіх грошай у гаспадарак няма. Часткова ў аператыўным парадку гэтыя прэпараты прадастаўляюць камерцыйныя структуры, размова аб формах разліку з якімі будзе весціся пазней. А пакуль што калгасам і сялянам рэкамендавана выганяць жывёлу на пашу пазней, калі прыгрэе сонца. А пашу спецыялісты раяць выбіраць далей ад лесу і забалочаных месц.

Прадугледжваецца, што на Брэстчыне машкара будзе рэальнай пагрозай для жывелы на працягу дзвюх першых дэкад мая.

Іван КУКСА.

Надвор'е

29 і 30 красавіка па краіне захаваецца воблачнае з праясненнямі надвор'е. Месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Вецер паўднёва-заходні, 6—11 м/с. Тэмпература паветра 29-га ўначы — +6...+11, удзень — +13...+18; 30 ўначы — +2...+7; удзень +11...+18.

Пр. Агапіі, Васілісы, Галіны, Ірыны, Нікі, Фядоры, Леаніда.
К. Багуслава, Пятра, Роберта.

КРАСАВІК
29
'99 ЧАЦВЕР

Усход 5.38	Поўня 30 красавіка
Захад 20.38	Захад 6.37
Даўж. дня 15.00	Усход 20.18

Ліст з эміграцыі

Аб небяспецы паслякамуністычных дыктатарскіх рэжымаў у Еўропе

Напрыканцы XX стагоддзя Еўропа зноў сутыкнулася з генацыдам і людабойствам на сваіх абшарах. Жорсткасць і цынізм, з якім на працягу апошняга паўгода сербская паліцыя і войскі паляць вёскі, знішчаюць і выганяюць з Сербіі грамадзян Сербіі — албанскае насельніцтва Косава, ёсць выклік усяму дэмакратычнаму свету. Гэта выклік прынцыпам, на якіх пагрунтаваны спакой і існаванне пасляваеннай Еўропы.

Збройная акцыя НАТО распачалася занадта позна і нерашуча, каб адразу прадухіліць масавае забіванне людзей. Рэжым Мілошавіча пасля папераджальнага бамбавання Сербіі толькі ўзмацніў вынішчэнне албанцаў. На сённяшні дзень сербы пераўтварылі Косава ў спалены край, разбурылі вёскі і гарады. Ужо палова насельніцтва правінцыі (каля мільёна чалавек) пакінула свае дамы і паселішчы. Іх сілком выгналі за межы краіны, сотні албанцаў расстралялі, выразалі і жорстка змардавалі, закапалі ў агульных магілах.

Няма сумнення, што Мілошавіч, якога прэзідэнт Чарнагорыі назваў "вар'ятам", будзе аб'яўлены злачынцам супраць чалавецтва і пойдзе пад Міжнародны трыбунал. Але не дзіўна, што людабойная палітыка Мілошавіча, заснаваная на нацыянал-бальшавізме, выклікала падтрымку ўсіх рускіх шавіністаў і пракамуністычных асоб у Расіі і Беларусі. Людзі, што не маюць адказнасці, гатовыя распаліць вайну ў Еўропе, зыходзячы толькі з сляпой нянавісці да Захаду і да заходняй цывілізацыі.

Менавіта фактар нянавісці пакладзены ў аснову абсалютна авантурнай прапановы аб стварэнні саюза Расіі, Беларусі і Югаславіі. Невыпадкова, што ў гэтую справу ўблытана такая адыёзная фігура, як прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, які з'яўляецца крэатурай імперскіх сіл Масквы і палітыка якога пагрунтаваная на нянавісці да Захаду і да празаходняй беларускай культуры. Дыктатары посткамунізму шукаюць адзін аднаго. Пачуцці і таемныя страсці, якія штурхаюць іх цяпер на чарговую авантуру, — аднолькавыя: уцягнуць Расію ў вайну і адпомсціць. Адпомсціць Захаду за яго вышэйшасць, за крыўды і непрызнанне. Адпомсціць хоць бы чужымі рукамі і цаной мільёнаў ахвяр, хоць бы і цаной уласнай пагібелі, але пагібелі "з музыкай" ды разам з "праклятай" Еўропай.

Я не раз казаў пра небяспеку маленькіх дыктатараў у Еўропе. Гісторыя, як назло, усё пацвярджае. Трэба ўлічыць, што беларускае грамадства, практычна поўнасцю пазбаўленае праўдзівай інфармацыі аб падзеях у Сербіі. Сродкі масавай інфармацыі, практычна цалкам манапалізаваныя рэжымам Лукашэнкі, і ствараюць, перакручаную карціну, насаджаюць істэрыку і ваенны псіхоз, запалохваюць і літаральна абалваньваюць жыхароў Беларусі. Гэта не можа не трывожыць, бо людзі ў Беларусі ў выніку прапагандысцкай апрацоўкі, не ведаюць і не разумеюць, што адбываецца на самай справе на Балканах, іхнія рэакцыі часта неадэкватныя, меркаванні фантастычныя, абумоўленыя дэзынфармацыяй тэлебачання і газет.

Гэтак жа сама, як у час выратавальнай вайны ЗША у В'етнаме. Захад зноў прайграе ў сферы інфармацыйнай прапаганды. Ён прайграе інфармацыйную барацьбу нават Лукашэнку, не кажучы ўжо пра шавіністычную Расію і рэжым Мілошавіча. У выніку — акцыя НАТО ў Югаславіі дапамагла вярнуць Лукашэнку страчаную палітычную ініцыятыву ў Беларусі, дала яму магчымасць адцягнуць увагу насельніцтва ад унутраных праблем і паставіць пад удар прэзідэнцкія выбары ў краіне.

Каб выратаваць сваю ўладу і рэжым, які ўжо пахіснуўся ў Беларусі, Лукашэнка хоча ўмела ўвязацца ў югаслаўскі канфлікт. Расія (разам з Захадам) прадастаўляе яму такую магчымасць. У каторы раз Беларусь хочуць зрабіць разменнай манетай у палітычных гульнях коштам яе свабоды, дэмакратыі і незалежнасці.

Мы бачым гэта. Беларускія дэмакратычныя вызвольныя сілы не атрымалі дзейснай рэальнай падтрымкі Захаду, а канфармісцкія прадстаўнікі Місіі АБСЭ ў Мінску не разбіраюцца ў абставінах, перашкаджаюць дэмакратычным вызвольным працэсам і гатовыя супрацоўнічаць з рэжымам Лукашэнкі. Так на абломках таталітарных імперый узрастаюць новыя фюрэры, рыхтуюцца аншлюсы, адбываюцца аб'яднанні дыктатараў.

Выклікае занепакоенасць памкненне дыктатарскіх рэжымаў звязаць у адно абставіны ў Беларусі і абставіны ў Югаславіі, бо ўсім вядомыя антызаходняя палітыка і недэмакратычны характар гэтых рэжымаў.

Толькі рашучыя, шматкроць узмоцненыя, магутныя і эфектыўныя дзеянні дэмакратычных краін, якія хутка дадуць вынік, спыняць генацыд у Косаве і прывядуць да капітуляцыі Мілошавіча, толькі такія дзеянні могуць прадухіліць уцягванне Беларусі ў Балканскі канфлікт і перарастанне яго ў зацяжную вайну.

Захад павінен, нарэшце, зразумець, што ліквідацыя антыдэмакратычнага рэжыму Лукашэнкі на Беларусі ёсць не другарадная, а стратэгічная задача еўрапейскай палітыкі, што не будзе ніякай дэмакратыі на ўсходзе Еўропы, пакуль існуе гэтая цёмная дыктатура, якая ўзнікла не сама па сабе, а як вынік агульных рэваншысцкіх нацыянал-бальшавіцкіх і панславянскіх працэсаў на руінах савецкай сістэмы.

Зянон ПАЗЬНЯК,
старшыня Беларускага народнага фронту "Адраджэнне".

На парозе

Нягледзячы на ўсе цяжкасці настаўніцкага жыцця, я выбіраю яго

Вучуся я ў 11-м класе. Перада мною, як прынята казаць, усё жыццё. І трэба выбіраць дарогу...

Мае бацькі — настаўнікі, і з дзяцінства я марыла стаць падобнай на іх. Тым больш што прызванне да гэтага, мяркую, у мяне ёсць. Другі год дапамагаю тату ў рабоце з вучнямі (ён класны кіраўнік сёмага класа) у падрыхтоўцы і правядзенні розных мерапрыемстваў. Дзеці мяне любяць, я гэта адчуваю, і я іх люблю. У гэтым годзе я паступіла на завочныя курсы ў педагагічны універсітэт імя М.Танка.

Цяпер я пачала больш разумець нялёгкую працу педагога, асабліва вясковага. Тым больш, калі прэстыж ведаў упаў і многія дзеці папросту не хочуць вучыцца. Знізілася — і гэта відавочна — павага да настаўніка. У мяне ж толькі ўдзячнасць за іх працу, за іх цеплыню, за іх жаданне даць нам як мага больш ведаў, накіраваць на добры шлях. Я не перастаю здзіўляцца: адкуль у маіх настаўнікаў бяруцца на гэта сілы?

Я разумею, як няпроста сёння настаўніку. Тых грошай, якія ён атрымлівае, не хапае на годнае жыццё, набыццё патрэбных кніг, на змястоўны адпачынак. Карацей — на ўсё тое, што дазваляла б яму несупынна папаўняць свой духоўны багаж і працаваць на яго прэстыж. Ён жа — дзяржаўны чалавек, які заслугоўвае павагі і вучняў, і іх бацькоў. Але адкуль быць той павазе, калі настаўніка не паважае родная дзяржава, робіць яго залежным ад усіх жабраком?

Толькі тады і з'явіцца павага, калі вясковы настаўнік не будзе залежаць ад мясцовых кіраўнікоў, да якіх ён ходзіць прасіць то сена, бо павінен трымаць карову, то збожжа, без якога не абысціся ў гаспадарцы. А без яе ў вёсцы зараз не пражывеш. Ды і ў час свайго "адпачынку" настаўнік не мае магчымасці адпачываць, знаёміцца з навінамі літаратуры і мастацтва (каб потым было аб чым расказаць сваім вучням), а працуе на калгасным полі, корпаецца на дзялках буракоў. Іначай яму могуць не даць ні таго сена, ні таго збожжа. Хіба ж будзе вучань глядзець з захапленнем на гэтага бяспраўнага, часам апранутага горш за іншага вучня чалавека, калі апошні будзе гаварыць пра адданую працу на карысць Радзімы, пра правы чалавека на годнае жыццё? Усё гэта застанецца для яго толькі абстрактнымі, не маючымі дачынення да рэальнасці словамі.

Калі я думаю аб усім гэтым, то з'яўляюцца сумненні наконт правільнасці майго выбару. Навошта мне ўсё гэта? Але я хачу бачыць сваю Беларусь заможнай, а яе людзей — шчаслівымі. Таму, нягледзячы на ўсе цяжкасці настаўніцкага жыцця, я выберу яго, каб выхоўваць у дзяцей павагу і любоў да ўсіх людзей, да роднай мовы, роднай зямлі. Бо менавіта гэта — аснова шчаслівага жыцця ў кожнай дзяржаве.

Вось, мабыць, і ўсё, што я хацела сказаць.

Вольга БАРАНАВІЦКАЯ,
вучаніца 11 класа.

в.Голацк
Пухавіцкага раёна.

Последняя статья

Утром, в день своей смерти, 6 апреля, Геннадий Дмитриевич Карпенко сел за компьютер, чтобы продолжить работу над статьей, которой он хотел еще раз привлечь внимание всех к экономической катастрофе, которая ожидает Беларусь. Он не успел отшлифовать этот материал. Но мы в редакции решили не править статью и дать в таком виде, в котором она осталась в компьютере Геннадия Карпенко.

Геннадий КАРПЕНКО,
заместитель председателя Верховного Совета Республики Беларусь 13-го созыва,
председатель национального исполнительного комитета,
член-корреспондент Национальной академии наук.

В Беларуси экономический кризис набирает угрожающие обороты

Похоже, что власть в Беларуси полностью потеряла всякие ориентиры в экономике. В январе и феврале этого года вместе с ростом цен правительство на 30 процентов вынуждено было признать и падение объемов производства. Теперь А.Лукашенко, экономист по жизни, как он себя называет, наконец-то сможет понять и разобраться сам, без ученых-экономистов, что жизнь людей ухудшается вместе с развалом народного хозяйства. И хотя правительство заверяет всех нас, что в марте оно сможет увеличить объемы производства, уровень жизни населения от этого не поднимется, а зная, какими методами правительство достигает роста объемов производства (путем печатания денег и вбрасывания их в убыточные производства), ясно одно: нас ждет еще более резкое повышение цен и дальнейшее ухудшение нашей жизни.

Понимая, что идет резкое обнищание населения, А.Лукашенко просит людей обождать до осени, когда, по его мнению, экономическая ситуация улучшится. Впрочем, нашему народу от этих обещаний уже и не холодно, и не жарко. Во-первых, он уже не ждет никакого улучшения и никому не верит, что такие улучшения вряд ли возможны вообще в нашем государстве. Во-вторых, никаких объективных оснований у нынешнего правительства нет и в ближайшей перспективе просто не предвидится, чтобы можно было говорить об улучшении экономики и жизни людей. Знают это прекрасно и в правительстве, поэтому молчат и не пытаются далее делать хоть какие-то прогнозы даже на ближайшее полугодие.

Думаю, догадываетесь и Вы об этом, Александр Григорьевич, как Вы часто выражаетесь, нутром чуете. Поэтому с целью отвлечь внимание от угрожающего экономического кризиса вместо конкретных мер и действий начинается кампания по разоблачению "воров и казнокрадов, банкиров и прочего жулья" укравших деньги из государственной казны. Вновь заводится старая пластинка, которая привела к успеху А.Лукашенко в 1994 году. Мы все помним заявления пришедшего к власти молодого президента, что казна пуста. Все украли. Но когда С.Антончик в своем докладе привел целый ряд фактов, куда и как уходили деньги из казны, кто крал из нового Вашего окружения, президент ответил, что его это не волнует, что это было до него. А сегодня вдруг заволновало. А о том, что вокруг А.Лукашенко и сегодня жулье, постараюсь убедить на примере первого заместителя председателя Совета Министров Василия Долголева.

Я убежден, Александр Григорьевич, что если Вы — настоящий борец с коррупцией, то, безусловно, примете соответствующие меры по этому "бедняге" Долголеву. И когда мы убедимся, что Вы строги и справедливы, мы назовем Вам следующего жулика, затем еще одного, и так далее. До полного их истребления в Вашем окружении.

И все же новая всенародная борьба с коррупцией, а вернее, пустая болтовня вокруг коррупции, ситуацию в экономике Беларуси не изменит. Безусловно, А.Лукашенко попытается вновь, как и пять лет назад накануне президентских выборов, увлечь доверчивых людей этой темой, заставить их забыть про невзгоды в своей жизни и в очередной раз наступить на те же грабли, которые так искусно были положены им в 1994 году.

Нужны новые громкие процессы над большими начальниками. А что с такими громкими делами, как Т.Винниковой, А.Климова, В.Леонова, В.Старовойтова? Почему эти люди сидят годами без суда и следствия? Для меня очевидно, что сидят они по политическим мотивам, так как отказались прислуживать Вам, Александр Григорьевич. Убежден, что и новая партия арестованных "жуликов" также будет сформирована Вами из числа тех, кто в конце концов решил порвать с этим режимом. Те же, кто совершил и совершает экономические, судебные, уголовные преступления под Вашим надзором и с Вашего благословения, будут находиться на свободе, страшно боясь, что эти благословение и свобода в один прекрасный момент закончатся вместе с Вами.

Для меня сегодня очевидно, что такого рода кампании надо прекращать. Люди, которые совершили финансовые преступления, должны отвечать перед судом. Президент не имеет права оскорблять, врать, фальсифицировать и распространять свои домыслы и весенние фантазии на всю страну вокруг коррупции и воровства. Президент обязан показать своему народу, что он и его команда в состоянии изменить жизнь людей к лучшему. И люди должны это видеть и чувствовать.

В Беларуси этого не произойдет. Ни осенью, ни в ближайшие два года. И вот почему.

Первое. У белорусского руководства нет реальных приоритетов ни в сфере производства, ни во внешнеэкономической сфере. В Программе социально-экономического развития Республики Беларусь на 1996—2000 годы сделана попытка обозначить эти приоритеты, однако на практике их реализация стала невыполнимой. Более того, ситуация в сфере производства стала просто угрожающей для экономики республики, для обеспечения социальных гарантий населения. Практически ничего не сделано с точки зрения инвестирования производства, его технического перевооружения, внедрения новой техники и технологии, хотя правительство планировало привлечь для этих целей до 1,2—1,5 миллиарда долларов иностранных инвестиций. Заявления о готовности поддержать частный бизнес, который занимается производством, на практике перечеркнуты внутренней и внешней политикой, проводимой сегодняшним руководством страны. Деловая активность людей, желание заняться производством в Беларуси сегодня сведены к нулевой отметке. Ни западные бизнесмены, ни местные предприниматели не желают рисковать своим капиталом и вкладывать его в долгосрочные проекты в Беларуси. А ведь, например, в США 90% новых технологий осваивается на малых предприятиях. В тех же США на малых предприятиях работают почти 60% рабочих. В Китае — 86% всей рабочей силы страны. Всего же в Европе на таких предприятиях, насчитывающих до 10 человек, работает 70 процентов всей рабочей силы. Более того, те проекты, которые находились на рассмотрении или были начаты в Беларуси, стали сворачиваться (завод "Форд", реконструкция трассы Брест — Москва, завод АО "Интеграл", завод имени Ленина и другие).

В этой связи просто удивляют приоритеты, поставленные на первое место во внешнеэкономической сфере, которые выбрало для себя белорусское правительство: экономическая интеграция с Россией, Казахстаном, Кыргызстаном. Ну сколько можно строить из себя клоуна, натянув колпак интегратора. Милые Вы мои члены правительства, безусловно, нельзя терять экономические связи со странами-соседями. Но приподнимите Вы хоть чуть этот колпак с глаз и увидите, что страны, которые Вы интегрируете, спят и видят, как бы завязать крепкие экономические связи с Европой, с США, получить инвестиции для развития своей промышленности.

Посмотрите, как борется за инвестиции и кредиты Россия. Все российское руководство — как теперешнее — Е.Примаков, Ю.Маслюков, так и бывшее — В.Черномырдин — делает все возможное, чтобы не разорвать связи с Западом, с МВФ. Наш же президент объявляет холодную войну Западу. Ему не нужны ни новые технологии, ни экономические связи, ни кредиты для поднятия народного хозяйства и улучшения жизни людей. Он возомнил себя эдаким отцом нации, все знающим и за всех отвечающим. К Беларуси у стран СНГ интерес не столь высок, как кажется это нашим интеграторам. И с каждым днем этот интерес переходит в чистую экономическую плоскость. Россия требует расчета твердой валютой и продовольствием, а не пустыми словами об интеграции. Не получая расчетов в долларах за газ, нефть, электроэнергию, Россия объявила о снижении поставок газа на 30%. Литва потребовала оплату 100 миллионов долларов за электроэнергию, заявив о снижении на 50% поставок в Беларусь. Польша и Украина и вовсе снизили свои объемы экономических связей с Беларусью в 1998 году. Вот такие сегодня у нас отношения со странами-соседями. Сегодня мы начинаем новую болтовню об углублении интеграции и расширении связей с Арабскими странами, Азией, Латинской Америкой. Одумайтесь и оглянитесь! В каком мире мы живем? Где находятся эти страны? Кто наши соседи? Как и куда движутся страны Европы? Как живет народ в этих странах? Безумцы, одумайтесь!

Второе. Ясно, чтобы преодолеть глубокий кризис, охвативший нашу страну, необходимо гражданское согласие, терпимость различных общественных и политических групп. Убежден, что такого согласия в нашей стране можно достичь. Однако вместо поиска путей к гражданскому согласию раз за разом развязываются никому не нужные политические и авантюристские противоборства, основной целью которых являются клевета, ложь, оболванивание населения. С помощью средств массовой информации делается все возможное, чтобы скомпрометировать, облить грязью своих оппонентов, разделить общество на несколько враждующих сторон и тем самым отвлечь внимание от основных проблем.

Белорусский народ приходит в такое состояние, когда он никому не верит или люто ненавидит обе враждующие между собой стороны: или власть, или оппозицию. Убежден, что в таком состоянии общество просто не может не только реализовать любые экономические реформы, но и даже их воспринимать.

Третье. За пять лет Беларусь превращена в страну-банкрота, на выход из этого состояния при принятии эффективных мер потребуются долгие годы. Курс, взятый на бесконечное печатание денег, самоизоляцию нашей страны от европейских государств, разрушение народнохозяйственного комплекса, отсутствие целенаправленной политики на приток инвестиции для обновления промышленной базы предприятий и колхозов, моральное устаревание и износ техники и технологий, практически привел нашу страну к состоянию банкротства. Все пять лет нахождения у власти А.Лукашенко Республика Беларусь имеет отрицательный баланс внешней торговли, величина которого не только не уменьшается, но и постоянно растет из года в год, достигнув в прошлом году катастрофической цифры 1,7 миллиарда долларов США. Естественно, такое положение дел не позволяет республике покрывать свои расходы за поставки энергоносителей (нефть, газ, электроэнергию), производить закупки медикаментов и оборудования.

В условиях, когда необходим жесткий режим экономии валютных ресурсов, президент развернул по всей республике грандиозные стройки катков, правительственных резиденций и баз отдыха под Минском, в Витебской и Брестской областях, на возведении которых задействованы строительные тресты и рабочие, численность которых превышает 2,5 тысячи человек, уничтожаются уникальные уголки природы, засыпаются и перегораживаются чистейшие лесные озера. Президент позволяет себе прогулки с сыновьями на Олимпийские игры в Японию, затраты на которые превышают 1 миллион долларов. Во время встречи с польскими коллегами, узнав о масштабах и количестве строящихся крытых катков в Беларуси, они не поверили этому и с удивлением спрашивали: "Неужели Вы такая богатая страна, что можете строить такое огромное количество спортивных дворцов? Ведь Польша, население которой насчитывает 40 миллионов, с трудом нашла в бюджете финансирование на строительство только одного комплекса, а Вы, маленькая бедная страна, — аж восемь. Зачем Вам это нужно?"

Сегодня долги государства вновь приближаются к отметке 1 миллиард долларов. И если раньше находились механизмы их списания (нулевой вариант), то теперь эти варианты исчерпаны. Сегодня Беларусь в состоянии оплачивать не более 15 процентов своих долгов. Остальное тяжелейшим грузом уже в ближайшее время ляжет на плечи трудящихся, сделав их жизнь просто нищенской.

Упершыню за пяць гадоў адмоўны рэйтынг прэзідэнта А.Лукашэнкі перавысіў станоўчы

Упершыню за пяць гадоў праўлення прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі колькасць яго перакананых праціўнікаў перавысіла колькасць перакананых яго прыхільнікаў. Аб гэтым паведаміў дырэктар Незалежнага інстытута сацыяльна-палітычных і эканамічных даследаванняў (НІСЭПД) прафесар Алег Манаеў, выступаючы 23 красавіка на брыфінгу Беларускай асацыяцыі фабрык думкі ў сталічным Доме літаратара з паведамленнем аб выніках сакавіцкага сацыялагічнага апытання. Колькасна сітуацыя выглядае так: перакананых прыхільнікаў у Аляксандра Лукашэнкі 21,8 працэнта, перакананых праціўнікаў — 26,1 працэнта. Ускосна гэты вынік пацвярджаецца вынікамі другога сацыялагічнага апытання на тую ж тэму, праведзенага сацыялагічнай лабараторыяй "Новак" у лістападзе—снежні мінулага года ў Мінску. Пра яго вынікі расказаў дырэктар лабараторыі прафесар Андрэй Вардамацкі на тым жа брыфінгу. Атрымаўшы пры апытаннях вынік: 29,5 працэнта — "за" Лукашэнку, 26,7 працэнта — "супраць", А.Вардамацкі задаўся пытаннем: ці не адбіваецца на адказах рэспандэнтаў той факт, што апытанне праводзіцца па месцы жыхарства, і, такім чынам, людзі апасаюцца, што іх адрасы стануць вядомы ўладам. Інакш кажучы, наколькі рэальны рэйтынг прэзідэнта адрозніваецца ад яго "рэйтынгу страха". З гэтай мэтай было праведзене "малое" (эксперыментальнае) апытанне. Адрозненне аказалася істотным. Калі апытанні праводзіліся ананімна, на вуліцах горада, прыхільнікаў у А.Лукашэнкі было (у працэнтах) толькі 26,9 працэнта, а праціўнікаў — 34,0 працэнта. Яшчэ большае адрозненне пры "хатнім" і "вулічным" апытанні было па працэнце тых, хто на пытанне "Ці з'яўляецеся Вы прыхільнікам ці праціўнікам А.Лукашэнкі" адказваў: "Не ведаю" або "Не магу адказаць". У першым выпадку (не ананімным) такіх было каля 50 працэнтаў, у другім (ананімным) — 43,6 працэнта.

Уладзімір ТРАЦЦЯКОЎ, БелаПАН.

Дипломатический курьер

Заботиться о латвийской визе стоит заранее

Любой житель нашей республики отныне может ознакомиться с красотами древней Риги, не имея соответствующего приглашения. Это стало возможным после того, как в Латвии приняты новые правила выдачи виз, вступившие в силу 19 апреля.

Как сообщили в посольстве этого государства в Беларуси, визу можно будет получить при предъявлении дорожных чеков из расчета 100 долларов на каждый день, а также билетов туда и обратно с фиксированными датами приезда и отъезда. Придется показать и документ из гостиницы о забронированном месте. Кроме того, можно получить разрешение на въезд по курортной или туристической путевке. Журналистам, собирающимся в Латвию в командировку, для оформления визы в посольстве понадобится лишь письмо из редакции, в котором будет изложена цель поездки. Не требуется приглашение, если в графе "национальность" паспорта значится "латыш", а также при наличии недвижимости или проживании одного из родителей в Латвии. Остальным категориям граждан, а также желающим оформить многократные визы, необходимо предъявить приглашение, заверенное в управлении по делам миграции и гражданства МВД Латвии.

Стоит однократная виза, в том числе и по путевке, 15 долларов США. Многократная полугодовая виза с общим сроком пребывания не более 90 дней обойдется в 50 "зеленых". Но эти цены распространяются лишь на случаи, когда оформление документов не нуждается в срочности. Если необходимо получить визу в 24 часа, взимается двойная госпошлина плюс 30 долларов за консульские услуги.

Живая картинка

Сон без антракта

На этого мужчину, наверное, обратила внимание не только я. Перед началом спектакля он достаточно долго и эмоционально общался с кем-то по сотовому телефону. Затем, нервно размахивая руками, что-то громко доказывал своей спутнице.

Уселись они минут через десять после начала театрального действа. Он сидел справа от меня. От него сильно пахло какой-то туалетной водой.

Спектакль был супер. В зале никто не вздыхал, не сморкался, не шуршал обертками от шоколадок. Зрители жадно ловили каждое слово актеров, периодически напоминали о своем присутствии восторженным смехом, искренними аплодисментами и... снова замирали. И вдруг я услышала храп. Нет, вначале это было просто нежно-свистящее посапывание, плавно переходящее в неприятный раскатистый звук. Где-то совсем рядом...

Наклонив голову набок, мой сосед сладко спал. Ему, видимо, было неудобно, поэтому он старался примоститься на плечо своей спутницы. Смущенная, она толкнула своего кавалера локтем в бок. От неожиданности он захлопал. Один во всем зале. Через несколько секунд хлопал уже весь зал, а мой сосед, оглядевшись, снова закрыл глаза. Когда растерянная дама разбудила мужчину еще раз и попробовала высказать ему свое негодование, он недовольно шикнул...

Вырваться из объятий Морфея моему соседу удалось только тогда, когда зрители закричали "Браво!". Казалось, его вид выражал полное недоумение и сумятицу: "Что это? Где я?.." Фу, оказывается, всего лишь закончился спектакль. На его лице заиграла бессмысленная улыбка...

Говорят, во сне сбываются все мечты. Правда, когда говорят актеры, а зрители спят, не до мечтаний...

Марина КОКТЫШ.

Просьба к тем, кто может помочь подготовить видеофильм и книгу о жизни Геннадия Карпенко

Семья и друзья Г.Д.Карпенко хотят подготовить видеофильм и книгу о жизни Геннадия Дмитриевича. В связи с этим они обращаются ко всем, кто располагает материалами о Г.Д.Карпенко, связаться по телефону **226-60-85** с Людмилой Филипповной Карпенко или **271-83-73** с Сергеем Антоновичем Антончиком.

Материалы будут непременно возвращены их хозяевам.

Арабскія Эміраты выбралі беларускую оптыку

Заказ на суму больш як 28 мільёнаў долараў ЗША на мадэрнізацыю ваеннай тэхнікі Арабскіх Эміратаў атрымала АТ "Пеленг" пры пасрэдніцтве кампаніі "Белтэхэкспарт".

Як стала вядома карэспандэнту, замежная бранятанкавая тэхніка будзе "ўзмацняцца" беларускімі оптыка-электроннымі прыборамі, якасць якіх — у разрадзе лепшых сусветных стандартаў.

Ларыса КАШТАНАВА.

Слабае месца пасяўной — забяспечанасць палівам

Каля 80 тысяч тон дызельнага паліва і 14 тысяч тон аўтамабільнага бензіну для пасяўной кампаніі было набыта на сродкі мэтавага ўрадавага крэдыту і адпраўлена ў калгасы і саўгасы рэспублікі. Дапамог земляробам з гаручым і канцэрн "Белнафтахім". Аднак, як паведамілі карэспандэнту ў рэспубліканскім аб'яднанні "Белаграснаб", гэтай колькасці паліва недастаткова для правядзення поўнамаштабных веснавых палявых работ. І сёння гаспадаркам прыходзіцца шукаць варыянты для папаўнення нехапаючых аб'ёмаў гаруча-змазачных матэрыялаў.

Ларыса КАШТАНАВА.

Выпрабаванні на вуліцах Рыгі

Дагавор на пастаўку ў латвійскую сталіцу партыі беларускіх аўтобусаў мае намер падпісаць з уладамі Рыгі вытворчае аб'яднанне "БелаўтаМАЗ". Як паведаміў на сустрэчы з журналістамі генеральны дырэктар гэтага прадпрыемства Валянцін Гурыновіч, адна з такіх машын ужо праходзіць выпрабаванні на вуліцах Рыгі.

Дарэчы, мінскія аўтобусы карыстаюцца ўсё большым попытам за межамі нашай рэспублікі. Трыццаць з іх ужо працуюць у Санкт-Пецярбургу, прадэманстраваўшы надзейнасць і камфортнасць. Вытрымала гэта тэхніка і праверку сібірскімі маразамі, з лепшага боку паказаўшы сябе на трасах Урэнгоя. Усяго ж на МАЗе сёння выпускаецца каля 80 мадэлей розных аўтамабіляў і 70 іх мадыфікацый.

Андрэй ВАРАТНІКОЎ.

"Атланты" не ўступілі "Індэзітам" і "Арыстонам"

Мадэлі новай па дызайне і тэхнічным рашэнні 170-й серыі халадзільнікаў прадэманстравала на 5-й Міжнароднай выстаўцы бытавой тэхнікі "Спажывец-Экспарт" у Алматы мінскае ААТ "Атлант".

Як паведамілі карэспандэнту ў знешнегандлёвай фірме прадпрыемства, гэтыя азонабяспечныя высокія халадзільнікі па шматлікіх водзывах спецыялістаў і наведвальнікаў нічым не ўступаюць па характарыстыках і зручнасці "шведскім прыгажунам" "Электралюкс", а таксама італьянскім "Індэзіт" і "Арыстон". А ў нечым нават пераўзыходзяць іх, напрыклад, па холадапрадукцыйнасці. Дарэчы, у вытворчасці "Атлантаў" выкарыстоўваюцца сёння выключна беларускія тэхналогіі. Так што стваральнікаў высакакласнай айчыннай бытавой тэхнікі застаецца толькі павіншаваць з поспехам.

Ларыса КАШТАНАВА.

"Я такі ж, як усе"

Так назвалі свой клуб маладой сям'і магілёўскія інваліды па зроку. Ён адкрыўся на базе Цэнтра культуры і адпачынку вытворчага прадпрыемства мясцовага таварыства інвалідаў па зроку. У праграме дзейнасці клуба — сустрэчы, гутаркі, кансультацыі з псіхолагамі, юрыстамі, медработнікамі і іншымі спецыялістамі, а таксама культурна-масавыя акцыі, конкурсы маладых сем'яў. Адным словам, усе тыя мерапрыемствы, якія дапамогуць маладым людзям не адчуваць сябе абдзеленымі.

Мікалай НАЗАРОВІЧ.

Стоп-кадр

Першы палкавы храм пабудаваны пад Мінскам

Першы ў рэспубліцы палкавы храм пабудаваны на тэрыторыі часці 3310 Унутраных войскаў МУС. Яна раскватаравана ў вёсцы Аколіца недалёка ад Мінска. На асвячэнне храма, пабудаванага ў гонар святога Іаана-воіна, 24 красавіка сабраліся служачыя часці, жыхары навакольных вёсак, вучні Тарасаўскай нядзельнай школы.

У цырымоніі асвячэння царквы Святога Іаана-воіна прынялі ўдзел мітрапаліт Філарэт і міністр унутраных спраў Беларусі Юрый Сівакоў.

Валянціна МЕНШЫКАВА.

Шчыра

Трэба толькі згуртавацца

Мы з мужам размянялі не адзін дзесятак гадоў, пабачылі многае на свеце. І навучыліся глядзець вакол адкрытымі вачыма, не хаваць галаву ў пясок, калі бывае страшна. І таму я хачу звярнуцца да іншых, хто яшчэ не разумее, чаму ён мусіць пакутаваць у галечы і беззаконні, аддаўшы дзесяцігоддзі цяжкай працы дзеля светлай будучыні.

Дарагія мае суайчыннікі! Няўжо вы не бачыце, што і чаму адбываецца ў нашай гаротнай краіне? Няўжо вы верыце хлусні ўлад, што ва ўсіх бядотах вінаваты не яны, а "дэмакраты", якія на самай справе ніколі не былі пры ўладзе? І вось цяпер, калі знайшліся ў Беларусі мужныя, адважныя сыны, гатовыя цаной уласнай свабоды і жыцця дабівацца лепшай долі для народа, — як жа патрэбна ім наша разуменне і падтрымка! Бо не за сябе — за нас усіх яны змагаюцца, церпяць здзекі і пакуты — як, напрыклад, Віктар Іосіфавіч Ганчар і яго паплечнікі. Яны хочуць знайсці шлях да новай Беларусі, убачыць нашых людзей заможнымі і шчаслівымі.

І гэта — магчыма. Трэба толькі згуртавацца вакол тых, хто наперадзе, хто адважваецца выклікаць агонь на сябе. А не сядзець у куточку — маўляў, мая хата з краю, а прынясуць мне дабро і шчасце на талерачцы — не адмоўлюся... Такая пазіцыя, лічу, не вартая сумленнага чалавека. Што ж нам скажуць уласныя дзеці і ўнукі, калі мы, старэйшыя, пакінем іх гібець у гнілым балоце, не скарыстаўшы шанец выбрацца з яго? Давайце, дарагія, скажам сабе: наша доля — у нашых руках!

Ганна СІЛЬЧАНКА, пенсіянерка.
г.Маладзечна.

Новы напрамак у трактарабудаванні адкрые гусенічны "Асілак"

У цэху доследнай вытворчасці Мінскага трактарнага завода заканчваецца зборка 250-сільнага гусенічнага трактара, які сваім з'яўленнем адкрывае новы для ўсяго рэгіёну краін СНД напрамак у трактарабудаванні.

Як паведамілі карэспандэнту на вытворчым аб'яднанні "МТЗ", гэта мадэль на гумаметалічных гусеніцах спалучае ў сабе перавагі колавай і "старой" гусенічнай тэхнікі, а таксама вельмі зручная для апрацоўкі буйных сельгасугоддзяў, дзе часта не хапае рабочых рук. Паводле ацэнкі спецыялістаў, пры дапамозе такога "асілка" земляробы змогуць рыхтаваць глебу і сеяць адначасова. Да гэтага часу толькі тры заходнія фірмы спецыялізаваліся на выпуску такіх універсальных машын, якія, што таксама немалаважна, аказваюць зменшаны ціск на глебу.

Ларыса КАШТАНАВА.

Пісьмы з вёскі

Узяў у рукі стос рукапісаў са 116 старонак, напісаных шчыльна і ад рукі, пагушкаў яго і прыкінуў: пацягне на добрую кілю. Не кожны журналіст узахвоціцца ўзяць ды прачытаць да канца такі "салідны опус". І я небязгрэшны, але вырашыў так: пакуль буду курыць цыгарэту і калі за гэты час не знайду нічога цікавага для сябе і чытачоў, то вынесу гэтым "мемуарам" самы суровы прысуд: у архіў! Але, закурыўшы наступную цыгарэту, я працягваў чытаць...

А было гэтае пісьмо ад Уладзіміра Мікалаевіча Ігнатовіча, жыхара вёскі Сліжы Лідскага раёна. Аўтару — 62 гады. Усе, як кажуць, да апошняга макавага зярнятка, пражыў у вёсцы, і свой радавод ведае на глыбіні трох стагоддзяў.

Чым больш я паглыбляўся ў "споведзь", тым больш выспявала думка: сапраўды, шмат што з пісьма трэба надрукаваць, бо напісана яно пякучым болем пра вёску, напісана з нянавісцю да тых, хто балаболіць пра яе праблемы, і толькі...

Прапаную чытачам "Народнай волі" ўрыўкі з гэтага шчырага пісьма...

Васіль ГРОДНІКАЎ.

Уладзімір ІГНАТОВІЧ, патомны селянін.

"Што ж вы, мужыкі, усё ў пазавуголлі..."

...Людзі прывыклі да цяжкіх умоў жыцця і трымаюцца іх як авечкі свайго хлява, нават у час пажару. Жыццё такое, што людзям яно стала абрыдлым і абыякавым. Ляжыць дабро безгаспадарча — няхай ляжыць, гніе — няхай сабе гніе. Гарыць нешта — няхай гарыць, не маё. Лупцуюцца п'яныя мужыкі сярод вуліцы, рэдзяць плот — няхай "размінаюцца". А што вы хочаце? Прэзідэнт узяў курс нашага жыцця ў мінулае, дзе вельмі хадавой была прыказка: "Твае-маё — калгаснае".

Цяпер ні сваё не берагуць, ні чужое, ні калгаснае (нічыё). Адно аднаго паважаць развучыліся, нянавісцю да чалавека веяць пачало, зайздрасць душу раздзірае. Усё вяртаецца назад, усплывае тое, што, здавалася б, і пахавана назаўсёды. І ўлада тая ж, што некалі была. Усе ранейшыя бюракраты яшчэ з савецкіх часоў сядзяць, як старыя грыбы, на ранейшых месцах, гэткія бюракраты — "дэмакраты", ад якіх дэмакратыі як ад казла малака. Раней хоць КПСС была са сваімі пярвічнымі арганізацыямі. Можна было таго-сяго заклікаць да парадку, да партыйнай дысцыпліны і сціпласці, выцягнуць на партыйны сход, на парткам, райкам. Скаргу напісаць у партыйныя органы, то была яшчэ такая-сякая спадзеўка, што, можа, каму і дадуць па загрыўку. А цяпер?

"Вертыкаль" для нас недаступная і недатыкальная. Гэта — парафія прэзідэнта. Ён яе стварыў, ёй і начальнік. Мы яе не выбіралі і ўздзеяння ніякага не маем. Вось і выходзіць, што ў нас, здавалася б, і народная ўлада, а народ — без улады. Сядзіш, так бы мовіць, у лазні ў Піліпаўку, а яна не палена яшчэ з леташніх Каляд! А прэзідэнт наш час ад часу пакажацца на блакітным экране, паб'е сябе ў грудзі, што быццам бы не дасць просты народ у крыўду, выцера насоўкай пот з ілба, і памінай як звалі!

Вы там, у "Народнай волі", часта пішаце, што жыхары вёскі — гэта людзі цёмныя, затурканыя і жывуць, як скаціна. Ім дадуць, як адчэпнага, крышачку пенсіі, трошачкі зарплаты, дык яны гатовы скакаць ад радасці. Гэта святая праўда! Ды і сярод гарадскіх шмат такіх, што з вёскі паўцякалі. Вы ж паглядзіце, хто на мітынгах, дэманстрацыях, шэсцях супраць рэжыму выступае. Думаеце, нядаўнія былыя вяскоўцы туды валам валяць?! Як бы не так! Іх вы больш знойдзеце там, дзе натоўп з чырвонымі сцягамі падтрымлівае прэзідэнта, рэжым, прыгоннае права на вёсцы.

Але душа баліць, калі бачыш, што меншаюць рады змагароў у калонах дэманстрантаў супраць рэжыму, супраць шляху ў светлае мінулае. Чаму людзі, нават гарадскія, ніяк не зразумеюць: ніхто ім шчаслівае жыццё на талерачцы не прынясе. За шчасце, дабрабыт, волю трэба змагацца! Я, вядома, не заклікаю хапацца за вілы і сякеры, за драбавікі ці абразанкі, але дух павінен ажывіцца! Той дух, што сілкуе смеласць, мужнасць, розум, здольнасць думаць і разумець, што тут да чаго. А ў нас часам духу хапае паабурацца начальствам тутэйшым і вышэйшым толькі ў пазавуголлі. І п'юць у пазавуголлі, і мочацца, і шахер-махер... На людзях — адно, па-за вочы — другое. Вось такая наша смеласць, а дакладней — двурушнасць. А з двурушным чалавекам лепей згубіць, чым знайсці. Ці, можа, не так я кажу?

Тыя, хто сёння намі кіруюць, раней за КПСС сцяной стаялі, гатовыя былі за ўсякую драбязу цябе з г... змяшаць, са свету зжыць. А потым, пры Кебічы? Таксама гарой за яго стаялі, затапталі нагамі Шушкевіча, лёталі па вёсках, хадзілі па хатах са скрынямі для галасавання, выклянчваючы ў вяскоўцаў галасы за свайго "патрона". А сёння ўсе яны пры Лукашэнку. І зноў гарой, і зноў сцяной, і зноў з кулакамі, з раз'юшанай ахвотай за яго ў агонь і ваду. Нават гатовыя лоб разбіць... на людзях. А пазавуголлі, за чаркай у цеснай кампаніі, у парылцы, дзе КДБ не рызыкне падслухаць, на лясной палянцы або ля вядра юшкі на беразе ракі: і тое не так "бацька" робіць, і гэта не так, узяў у клешчы, што аж рэбры трашчаць, ды і наогул...

Пішу гэтая словы вам, журналістам "Народнай волі", не для таго, каб вы паспрыялі нешта выправіць, а пішу для таго, каб вяскоўцы нашы прачыталі гэта ды хоць трошкі за патыліцай пачухалі. Хоць горкая гэтая праўда, але ж праўда такая, якой яна на самай справе выглядае.

Можа, прыедзе і да мяне, як ужо з некаторымі было, такімі "журналістамі" як я, упаўнаважаны КДБ, каб правесці са мной так званую "гутарку". Няхай сабе прыязджае. За стол запрашу, чарку пастаўлю, яечні насмажу. Пасядзім, пагаворым. Ну што ён мне зробіць? Я ж, як і ён, за народаўладдзе, за канстытуцыйны лад, за талковы парадак у краіне, за лепшае жыццё для нас, вяскоўцаў. На развітанне, спадзяюся, пацісем адзін аднаму руку. Ён жа таксама за тое. Пры мне, упэўнены, менавіта пра гэта будзе сцвярджаць. А ў пазавуголлі? Хто ж яго ведае... Вось як сустрэнуся і калі не павязе ён мяне з сабой, то напішу тады вам дадаткова...

Гэта такі вось мой край, наша наваколле, на фоне якога я раскажу вам пра з'явы, якія ў нас адбываюцца і якія прымушаюць нас быць тымі авечкамі, якія трымаюцца свайго хлява.

(Працяг у наступным нумары.)

в.Сліжы Лідскага раёна.

Народная Воля
29 КРАСАВІКА 1999 г.

Бывает же...

Захоронил жену в запаянной трубе

Было ли самообороной убийство 54-летним Лео Майнером из Флориды, покажет дальнейшее следствие, однако факт тот, что он захоронил ее в запаянной трубе, очень настораживает. Сам Лео говорит, что сильно испугался ее смерти и не придумал ничего лучшего. Он задумал было подстроить бегство своей жены, но полиция случайно нашла ее одежду и личные вещи. Тогда Майнер во всем признался и рассказал, что она пошла на него с палкой.

Тогда, выхватив из рук у своей жены эту палку, Майнер сам трижды ее ударил, после чего и заварил в железной трубе.

Майнеру было предъявлено обвинение в убийстве, срок заключения может достигать 30 лет, но, поскольку медицинская экспертиза не смогла выяснить точную причину смерти, прокуроры сошлись на возможном 12-летнем сроке заключения.

Миллионы не помогли

Калифорнийский мультимиллионер 63-летний Брюс Нослар совершенно неадекватно отреагировал на выдвинутое ему обвинение в изнасиловании. Дело в том, что Нослар и его соучастница похитили 17-летнюю девушку, которую затем накачали наркотиками и изнасиловали, отсняв это все на видеокамеру. При обыске было найдено еще несколько видеокассет подобного содержания, на которых возраст заснятых девочек составлял не более восьми лет. Обвинений получилось немало: похищение с целью изнасилования, сексуальная атака, незаконные операции с наркотиками, хранение детской порнографии. Вероятно, он получил бы пожизненное заключение, однако этого не случилось. Нослар застрелился, не дождавшись начала слушаний.

Замки Чехии

Замок Карлштейн.

Замок Конопиште.

БСДП (НГ) падпісала пагадненне аб супрацоўніцтве з Латвійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыяй

Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Народная Грамада) падпісала пагадненне аб супрацоўніцтве з Латвійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыяй (ЛСДРП) падчас візіту ў Латвію старшыні БСДП (НГ) Мікалая Статкевіча. У гутарцы з карэспандэнтам БелаПАН лідэр партыі паведаміў аб тым, што супрацоўніцтва латышскіх сацыял-дэмакратаў будзе пакуль у асноўным ажыццяўляцца ў [illegible] рэгіянальных арганізацый БСДП (НГ). Трэба адзначыць, што гэта ўжо трэцяе міжпартыйнае пагадненне, падпісанае беларускімі сацыял-дэмакратамі са сваімі замежнымі партнёрамі. Дагэтуль падобныя дакументы былі падпісаны БСДП (НГ) з Сацыял-дэмакратычнай партыяй Германіі і Сацыял-дэмакратычнай партыяй Рэспублікі Польшча.

Юрый ПАЦЁМКІН.

Польскія беларусы хочуць дапамагчы суайчыннікам, якія пацярпелі ад паводкі

У Беластоку і Беластоцкім ваяводстве, дзе кампактна пражываюць беларусы — грамадзяне Польшчы, пачалася акцыя па збору сродкаў пацярпелым ад паводкі ў Беларусі. Дапамагчы вырашылі Беластоцкае царкоўнае брацтва і Беларускае грамадска-культурнае таварыства, якія пачалі збор сродкаў у прыходах ваяводства. Акцыя прадоўжыцца да 17 мая. Тады плануецца адправіць канвой з дапамогай у Мінск.

Юрась ЗЯНКОВІЧ.

Вести из Германии

Гельмут Коль и на Луне будет канцлером

Четыре тысячи немцев — владельцев "земельных участков" на Луне — избрали Гельмута Коля лунным канцлером и решили выделить ему для резиденции 7 млн. квадратных метров лунной площади из общих запасов. Лунные участки уже много лет продает один американец, который в нескольких учреждениях Сан-Франциско числится хозяином Луны и всех планет Солнечной системы.

Скандалы мюнхенской полиции

В мюнхенской полиции не прекращается серия скандалов. В конце февраля полицейские довели до самоубийства свою 22-летнюю коллегу, а в марте служащие спецподразделения обработали кислотой телефонную трубку и компьютерную мышь 32-летней секретарши, чем нанесли ей увечья. Еще раньше пьяные полицейские устроили между собой перестрелку.

Представители СДПГ и "зеленых" Баварии назвали смехотворным предложение главы МВД Баварии улучшать образование полицейских, указав на то, что полицейский аппарат срастается с криминальным миром. Трое только что арестованных полицейских торговали наркотиками, нелегально ввозили в страну чешских проституток, а также продавали уголовным боссам секретные сведения (кстати, и в Берлине арестованы два крупных полицейских чиновника, продававших преступным группам конфиденциальную информацию о ходе расследований). Ранее по той же причине были уволены двое берлинских полицейских.

Лазер, который излучает не свет, а отдельные атомы

Как сообщает журнал "Фокус", мюнхенским физикам из Института квантовой оптики им.Макса Планка удалось разработать лазер, излучающий не свет, а отдельные атомы. Это открытие, которое будет представлено вскоре на конгрессе Физического общества в Гейдельберге, должно найти широкое применение, в частности, в компьютерных технологиях.

"BMV" — в Калининграде

Как сообщает еженедельная газета "Вельт", автоконцерн "BMV" и его дочерняя фирма "Rover" собираются строить крупный сборочный завод в Калининграде. Ориентировочная стоимость проекта — 51 млн. DM.

Россия не желает, чтобы немцы обучали чеченцев обезвреживанию мин

Россия официально потребовала от Германии прекратить обучение чеченцев военным профессиям, в частности, обнаружению и обезвреживанию мин.

Конкретно речь идет о группе из четырех чеченцев, прошедших недавно под Берлином двухнедельный курс обезвреживания мин. Инструкторов и полигон предоставила фирма "Гербера", а расходы по обучению (10.000 DM) покрыло министерство иностранных дел ФРГ.

Как утверждают немецкие источники, после ухода российских войск в чеченской земле остался 1 миллион мин. Устанавливали их не только российские военные, но и чеченские боевики, кто больше — сказать сейчас трудно, но самые коварные и дешевые противопехотные мины широко применяли как раз чеченцы. Кстати, цена одной такой "игрушки", навсегда делающей человека калекой, — всего 3 доллара.

Немцы, французы и англичане еще в середине 90-х начали постепенно сворачивать производство примитивных мин, перейдя к разработке более сложных, многоцелевых. Кроме того, ряд немецких фирм стал специализироваться на миноискателях и роботах для разминирования, получая на это крупные субсидии от Евросоюза, ООН и правительства.

Однако, как в извечном соперничестве снаряда и брони совершенствуется то одно, то другое, так и в минном деле разработка помогает тем, кто эти мины конструирует. А это, как правило, одни и те же концерны. Сегодня специальные роботы могут обезвредить максимум 80 процентов типов мин, остальные сдаются только перед руками опытных минеров. Есть сведения, что осенью в Германию приедет следующая группа чеченцев.

Леонид ЧЕРЕПОВИЦКИЙ,
собственный корреспондент "Народной воли" в ФРГ.

Розовые затычки для ушей

Розовые затычки для ушей фирмы "Boules Quies" известны во всем мире. Совсем недавно они отпраздновали свое восьмидесятилетие.

"Boules Quies" — старая фирма. Она существует уже около восьмидесяти лет. Весьма важно, что затычки для ушей еще древнее. Древний мир гласит, что когда после окончания Троянской войны Одиссей отправился на родину в Итаку, его корабль проплывал мимо побережья, где сладкоголосые сирены завлекали своим пением мореплавателей на прибрежные скалы. Одиссею удалось избежать опасности, заткнув своим спутникам уши воском.

Подлинная история возникновения затычек менее романтична, чем миф Гомера. Однако их изобретатели могли бы сравняться с Одиссеем в хитроумии. История начинается в 1918 году. Слишком шумные соседи мешают мадам Анри-Лепот уснуть. Измученная бессонницей женщина одержима одной мыслью: найти во чтобы то ни стало "сурдинки" — маленькие восковые шарики, выпускаемые в Германии. Мадам Анри-Лепот имела привычку затыкать ими уши, забываясь в объятиях Морфея. По ее просьбе парижский аптекарь изготавливает милые сердцу "сурдинки", и бедняжке наконец удается спокойно заснуть. Так и родились первые "Boules Quies". За восемьдесят лет своего существования они практически не изменились: их по-прежнему изготавливают из ископаемого воска. Каждый шарик надежно упакован в слой белой ваты. Затычки, в те времена еще не носившие названия "Quies", быстро стали популярными. А в 1921 году начала свою работу коммерческая фирма по внедрению нового изделия. В то время в большой моде была античность и Древний Египет. Затычки стали называть латинским словом "Quies", что означает отдых, покой. Их продают в красивой алюминиевой коробочке, крышка которой украшена изображением орла и иероглифами. Затычки для ушей быстро становятся незаменимыми. Они получают почетные дипломы на всех крупных фармацевтических выставках.

До сороковых годов затычки производили вручную. В лабораториях "Quies" изготовлялась восковая масса, которую затем нарезали на маленькие кубики и доставляли на дом рабочим, которые в свою очередь сначала нагревали их до нужной температуры, чтобы облегчить манипуляции, а затем превращали кубики в шарики. Для того чтобы шарики получались ровными, нужна была настоящая сноровка. Затем затычки оборачиваются в слой ваты. Эта традиция просуществовала до шестидесятых годов. А затем машины пришли на смену надомным работникам. В ту эпоху на фабриках выпускалось каждый год примерно 8 миллионов "Quies". Теперь же их производство выросло до 50 миллионов (последние пять лет сбыт продукции увеличивается в год на 5 процентов). Старое оборудование было заменено более современным. Даже приготовление восковой массы, рецепт которой хранится в тайне, автоматизировано. И лишь на заключительной стадии производства рабочие в перчатках сортируют затычки и проверяют качество изделий.

"Boules Quies" по-прежнему пользуется спросом в Европе и Америке. Без них не обходятся ни страдающие бессонницей, ни студенты во время сессий, ни женщины, спящие бок о бок с храпящими мужьями, ни горожане, спать которым мешают соседи и машины... Их услугами пользуются единовременно или же постоянно. Они способны понизить шум на 27 децибелов. Некоторые противники затычек утверждают, что слышат в ушах биение собственного сердца. Ничего подобного! Просто они не умеют ими пользоваться. Прежде чем заткнуть уши, необходимо выпустить сжатый воздух, находящийся между барабанной перепонкой и затычкой!

Сильви БЮЛЛО.
Материал подготовлен при содействии Посольства Франции в Беларуси.

Березовского отпустили под подписку

Представитель Генпрокуратуры сообщил, что на допросе г-ну Березовскому предъявлено обвинение по трем статьям УК РФ — незаконное предпринимательство, отмывание нелегальных денег и лоббирование. С Березовского взята подписка о невыезде, однако он может с разрешения следователя свободно передвигаться, в том числе выезжать и за границу. Следующий допрос Березовского состоится после майских праздников. Говоря о своих впечатлениях от первой встречи с подследственным, Николай Волков заявил, что "все прошло нормально, в корректной форме". После допроса Березовский отправился долеживать в ЦКБ, сказав журналистам, что намерен "добиться демонстративно однозначного результата". "Я уверен в своей правоте и надеюсь, что после того, как мы добьемся успеха, не смогут поступать по отношению к другим, как поступили по отношению ко мне. Я чувствую себя абсолютно комфортно".

Сысуев о Ельцине и Примакове

Первый заместитель руководителя администрации президента Олег Сысуев определил взаимоотношения президента и премьера: Евгений Примаков является стратегическим союзником президента в достижении цели стабилизации накануне выборов в Государственную Думу. Этой задаче должно быть подчинено все, в том числе на ее решение работает и Примаков". "Недостатки в работе правительства есть, но работа над ошибками должна проводиться в тесном контакте с администрацией президента". Отвечая на вопрос о судьбе "левых" вице-премьеров правительства в случае, если Госдума проголосует за импичмент президенту, он сказал, что "никакого положительного для оппозиции голосования не будет". Однако "если предположить, что это случится, то нужно будет переоценить тезис о том, что Госдума поддерживает правительство". По мнению Сысуева, Примаков "мог бы и должен был бы пересмотреть состояние платонической любви Госдумы к правительству!".

ЕС усиливает санкции против Югославии

Европейский Союз решил усилить санкции против Югославии.

Одной из мер станет запрет на выдачу въездных виз в 15 стран Союза президенту Слободану Милошевичу, членам его семьи и министрам югославского правительства. Ранее этот запрет распространялся лишь на лиц, несущих, по мнению ЕС, непосредственную ответственность за репрессии в Косово. Среди других санкций, одобренных "пятнадцатью", расширение запретов на экспортные кредиты югославским частным предприятиям, на инвестиции, на поставку оборудования, которое может быть использовано для внутренних репрессий. Кроме того, страны ЕС решили не допускать участия югославских спортсменов в международных соревнованиях, проводящихся на их территории.

Международной организации труда — 80 лет!

Свобода объединения: право работников и предпринимателей создавать организации без предварительного разрешения

(Продолжение. Начало см. в №№22 и т.д. за этот год)

Ст. 2 Конвенции 87 Международной Организации Труда (МОТ) о свободе объединения и защите права на организацию гарантирует право трудящихся и предпринимателей создавать организации без предварительного разрешения со стороны органов государственной власти. В ходе подготовительной работы к принятию Конвенции отмечалось, что государства будут иметь полную возможность предусматривать в своем законодательстве такие формальности, которые представляются необходимыми для обеспечения нормального функционирования организаций. Национальные положения, регулирующие создание организаций, следовательно, сами по себе не противоречат положениям Конвенции, при условии что они не затрагивают гарантий, предоставляемых Конвенцией.

Предоставление устава организации. Национальное законодательство, предусматривающее представление организацией ее устава, совместимо со ст. 2 Конвенции 87 в том случае, если это является лишь формальностью с целью сделать его доступным для общественности. Но проблемы могут возникнуть в случае, когда компетентные органы обязаны по закону настоятельно просить учредителей организаций включить в устав некоторые положения, не согласующиеся с принципами свободы объединения.

Регистрация. Она может производиться в судебной инстанции или компетентном административном органе и быть обязательной или факультативной (то есть по усмотрению самой организации). Последняя может представлять собой либо простую формальность, наподобие представления устава, либо настоящую регистрацию, обставленную более или менее жесткими условиями и имеющую различные последствия для функционирования организации.

Там, где регистрация факультативна, отказ от ее осуществления не мешает организациям существовать и функционировать. Проблемы могут здесь возникнуть, если регистрация дает существенные преимущества, например, особые льготы, освобождение от уплаты налогов, право участвовать в урегулировании споров или процедуре рассмотрения нечестной практики трудовых отношений, а также быть признанным в качестве единственного представителя данной категории трудящихся на переговорах. Такое законодательство в принципе не противоречит Конвенции 87. Однако подобная система преимуществ иногда затрагивает основополагающие права, необходимые для защиты и обеспечения интересов членов организации; если компетентный орган вправе по своему усмотрению отказывать в регистрации, это на практике равносильно системе предварительного разрешения, противоречащей принципам Конвенции 87.

Во многих странах регистрация обязательна и является условием для нормального функционирования организации. Формальности, связанные с понятием регистрации, в законодательстве конкретных государств различны. В ряде случаев все, что требуется, — это представить устав организации, возможно, с подробностями о руководителях и учредительном собрании, с тем чтобы регистрирующий орган смог убедиться в том, что организация соблюдает профсоюзное законодательство. В таких случаях компетентный орган, как правило, не располагает полномочиями решать вопрос исключительно по своему усмотрению, поэтому подобные положения не противоречат Конвенции 87.

В ряде других стран, однако, законодательство четко не определяет формальную процедуру, которую требуется соблюсти, или причины, по которым компетентный орган вправе отказать в регистрации. Это уже *может*, в зависимости от конкретных обстоятельств, оказаться равносильным требованию предварительного разрешения, что несовместимо с Конвенцией 87.

Если же законодательство предоставляет компетентному органу право полностью по своему усмотрению регистрировать или отказывать в регистрации, выдавать или не выдавать разрешение на создание и деятельность организации, то такие положения однозначно расцениваются Комитетом экспертов МОТ как равносильные требованию о предварительном разрешении, что несовместимо со ст. 2 Конвенции 87.

В ряде случаев процедура регистрации продолжительна и сложна или же правила регистрации применяют таким образом, что это противоречит ее целям, а компетентные административные органы чрезмерно используют свое усмотрение и им помогает в этом нечеткость соответствующего законодательства. Эти факторы могут стать серьезным препятствием для создания организации и превратиться на практике в отказ трудящимся и предпринимателям в праве создавать организации без предварительного разрешения, что является нарушением Конвенции 87.

Признание в качестве юридического лица. Ст.7 Конвенции 87 предусматривает, что приобретение прав юридического лица организациями трудящихся и предпринимателей, их федерациями и конфедерациями не может быть подчинено условиям, способным воспрепятствовать применению положений статей 2, 3 и 4.

Следовательно, законодательство совместимо с положениями Конвенции, если оно автоматически наделяет организацию статусом юридического лица в момент ее создания — будь то при создании без формальностей, при представлении устава, при процедуре регистрации или при выполнении других формальностей, совместимых с Конвенцией. Однако если законодательство делает приобретение статуса юридического лица предпосылкой для существования и деятельности организаций, условия приобретения этого статуса не должны быть фактически равносильными требованию предварительного разрешения на создание организации, что на деле поставило бы под вопрос применение ст. 2 Конвенции 87. Нельзя отказывать в статусе юридического лица организациям, если они отвечают требованиям закона.

Обращение в суд. Организации трудящихся и предпринимателей должны обладать правом обращаться в независимый суд по поводу административного решения, относящегося к их регистрации, что является необходимой гарантией против незаконных и необоснованных решений регистрирующих органов.

Следует отметить также, что право на обжалование в суде само по себе не служит достаточной гарантией защиты права на объединение. В дополнение к нему компетентные судьи должны обладать необходимой компетенцией на рассмотрение на основе всех материалов дела причин отказа, выдвинутых административными органами (причем эти причины не должны противоречить принципам свободы объединения), а также на незамедлительное вынесение решения и, когда это необходимо, требование принятия мер по исправлению положения.

Принцип свободного создания организаций может быть нарушен и тогда, когда законодательство об общественных и частных собраниях предусматривает необходимость предварительного разрешения для проведения *любых* собраний со стороны правительства или административных органов. Такие требования равносильны предварительному контролю со стороны государства при создании организаций предпринимателей и трудящихся, в частности, профсоюзов.

В заключение данной статьи напоминаем, что Беларусь является не только членом МОТ, но и ратифицировала 6 ноября 1956 г. конвенции N 87 и 98 о свободе объединения, а 12 ноября 1973 г. Международному пакту об экономических, социальных и культурных правах и Международному пакту о гражданских и политических правах.

Поэтому все вышеизложенное обязательно для исполнения, исходя из ст. 8 Конституции и ст. 4 Кодекса законов о труде, гласящей: "Если международным договором (соглашением, конвенцией), в котором участвует Республика Беларусь, установлены иные правила по сравнению с предусмотренными в ее законодательстве о труде, то применяются правила этого договора (соглашения, конвенции)".

Виктор Иванович КРИВОЙ,
доктор юридических наук,
независимый
консультант-эксперт.

Редакция обращается с просьбой к читателям сообщать о практике реализации в нашем государстве принципа свободы объединения, в том числе об имеющихся нарушениях, чтобы сначала на страницах газеты осветить их, а затем организовать "круглый стол" с участием представителей правительства, объединений работников и предпринимателей, а также специалистов Международной организации труда. Тем самым мы будем способствовать внедрению на Беларуси общепризнанных мировых стандартов.

Пазіцыя

Алесь МІХАЛЕВІЧ:

"Мы імкнёмся абараняць правы студэнтаў"

Задзіночанне беларускіх студэнтаў (ЗБС) стварылася як вынік працы нефармальных студэнцкіх аб'яднанняў у канцы 80-х гадоў. Спачатку працавала нелегальна і было зарэгістравана ў Міністэрстве юстыцыі толькі ў 1992 годзе, а затым, у 1995-м, прайшло перарэгістрацыю.

Сёння Задзіночанне беларускіх студэнтаў — адна з найбуйнейшых беларускіх студэнцкіх арганізацый — з'яўляецца паўнапраўным членам ESIB (Нацыянальнага Студэнцкага Саюза Еўропы), налічвае каля тысячы сяброў, суполкі ЗБС існуюць у 10 гарадах Беларусі, а таксама ў Варшаве і Лондане. Па словах Алеся Міхалевіча, старшыні ЗБС, арганізацыя выступае за студэнцкае самакіраванне, беларускамоўнае навучанне і рэфарміраванне сістэмы адукацыі паводле еўрапейскіх стандартаў.

— Алесь, а ці існуе ў прынцыпе гісторыя студэнцкага руху ў Беларусі?

— Зразумела, існуе. І сваімі каранямі сыходзіць у глыбокае сярэднявечча, калі ў заходнееўрапейскіх універсітэтах навучалася даволі значная колькасць беларусаў. У той час ствараліся шматлікія таварыствы, карпарацыі, якія аб'ядноўвалі выхадцаў з пэўнай краіны. Найбольш вядомая карпарацыя "Летуанія" Кёнігсбергскага універсітэта. Затым, ужо ў XIX стагоддзі, актывістамі студэнцкага руху былі Кастусь Каліноўскі і Ігнат Грынявіцкі... А на пачатку нашага стагоддзя ў Расіі пры Маскоўскай Ціміразеўскай сельскагаспадарчай акадэміі існавала асацыяцыя студэнтаў-беларусаў, якую ўзначальваў Гаўрыла Гарэцкі, выдаваўся часопіс "Маладая Беларусь". Пазней усе ўдзельнікі гэтага руху прайшлі праз сталінскія лагеры, а некаторых з іх проста ліквідавалі. У гэты ж час у Заходняй Беларусі праводзілася палітыка паланізацыі і знішчэння беларускамоўнага навучання. І адной з асноўных арганізацый супраціўлення стаў Беларускі студэнцкі саюз, што існаваў пры Віленскім універсітэце. Ён выдаваў часопіс "Студэнцкая думка", розныя брашуры, улёткі, арганізоўваў чытанні лекцый, стварыў свой хор... Але і гэтая арганізацыя, як і шматлікія іншыя, была знішчана савецкай уладай. У часы Савецкага Саюза беларускі студэнцкі рух існаваў толькі ў замежжы. Таталітарная дзяржава не давала магчымасці ўзнікнуць іншым арганізацыям, акрамя камсамола. Але ў 80-х гадах, нягледзячы ні на што, стварыліся "Майстроўня", "Талака", а пазней і ЗБС праз аб'яднанне нацыянальных студэнцкіх груп з розных вышэйшых навучальных устаноў Мінска. Шмат хто лічыў нас маладзёжнай арганізацыяй БНФ, але гэта не так. Зразумела, мы падзяляем погляды БНФ у пытаннях беларусізацыі і рэфарміравання сістэмы адукацыі, але абсалютна не залежым ад Фронту.

— А якім чынам ты трапіў у студэнцкі рух?

— Я навучаўся ў Беларускім гуманітарным ліцэі і ўжо там зразумеў, што хачу працаваць у якой-небудзь маладзёжнай арганізацыі нацыянальнага накірунку. Паступіў на юрыдычны факультэт БДУ, прыйшоў у ЗБС. Пачаў выконваць розную працу і ў 1997 годзе быў абраны старшынёй арганізацыі. Зараз з'яўляюся аспірантам Інстытута філасофіі і права Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

— Якія асноўныя накірункі працы ЗБС можна вылучыць?

— Асноўны накірунак — абарона сацыяльных і эканамічных правоў студэнтаў. Акрамя гэтага мы арганізоўваем семінары, "круглыя сталы", перамовы. Правялі агульнарэспубліканскую канферэнцыю "Нацыянальная вышэйшая школа на Беларусі". Ладзілі шэраг пікетаў і дэманстрацый у абарону правоў моладзі, за дзяржаўнасць беларускай мовы. Мы былі ініцыятарамі і аднымі з арганізатараў Першай сустрэчы беларускай моладзі свету ў 1994 годзе. Заўсёды дапамагаем у падрыхтоўцы фэстаў бардаўскай песні, самі правялі нацыянальны бардаўскі фэст "Менск-96". Ужо наладжаны выпуск кніжак маладых аўтараў — сяброў ЗБС, з дапамогай кампаніі "Тэхналёгія" выдадзены руска-беларускія слоўнікі па хіміі, фізіялогіі, ваеннай тэрміналогіі, рэгулярна выдаём часопіс "Студэнцкая думка". У бліжэйшы час плануем наладзіць навучальныя семінары для студэнтаў у пытаннях дзейнасці грамадскіх арганізацый, распачаць і праводзіць курсы замежных моў і камп'ютэрнага майстэрства. Рыхтуемся да правядзення пікетаў супраць прымусовага размеркавання, студэнтаў абавязковай ваеннай службы і прызначэння рэктараў і дэканаў прэзідэнтам.

— Чым вас не задавальняе абавязковае размеркаванне студэнтаў пасля заканчэння ВНУ?

— Паводле Канстытуцыі, кожны чалавек мае права на адукацыю. Таму нельга сцвярджаць, што дзяржава за цябе плаціла, таму ідзі і адрабляй на працягу двух гадоў. Плаціла не дзяржава, а грамадзяне, якія выплачвалі падаткі, бацькі тых жа студэнтаў. У свабоднай дзяржаве кожны чалавек сам выбірае, дзе працаваць пасля атрымання вышэйшай адукацыі. Тым больш што зараз размеркаванне вядзецца з грубымі парушэннямі.

— А як складваюцца ўзаемаадносіны з адміністрацыямі ВНУ, і ці маеце вы нейкія стасункі з так званым пралукашэнкаўскім Беларускім патрыятычным саюзам моладзі?

